МАГІЛЁЎСКІ АБЛАСНЫ
ВЫКАНАЎЧЫ КАМІТЭТ
**МАГІЛЁЎСКІ ГАРАДСКІ
ВЫКАНАЎЧЫ КАМІТЭТ**

вул. Першамайская, 28а
212030, г. Магілёў
тэл. (0222) 42 20 33, тэл (0222) 42 24 67
E-mail: mgec@mogilev.by; сайт: www.mogilev.gov.by
р/р BY95 AKBB 3604 0174 4059 1700 0000
МАУ № 700 ААТ ААБ «Беларусбанк»,
код AKBBBY2X, УНП 700123787

МОГИЛЁВСКИЙ ОБЛАСТНОЙ
ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ
**МОГИЛЁВСКИЙ ГОРОДСКОЙ
ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ**

ул. Первомайская, 28а
212030, г. Могилёв
тел. (0222) 42 20 33, тел (0222) 42 24 67
E-mail: mgec@mogilev.by; сайт: www.mogilev.gov.by
р/р BY95 AKBB 3604 0174 4059 1700 0000
МОУ № 700 ОАО АСБ «Беларусбанк»,
код AKBBBY2X, УНП 700123787

18.10.2023 № Кол-2082

на № ____________ ад ____________

Магілёўскі гарадскі выканаўчы камітэт (далей – гарвыканкам), разгледзіўшы калектыўны зварот грамадзян ад 04.10.2023 № Кол-2082 па пытанні перайменавання плошчы Арджанікідзэ ў Магілёве ў гонар Георгія Каніскага, паведамляе.

Пытанне перайменавання плошчы Арджанікідзэ ў плошчу імя свяціцеля Георгія Каніскага было разгледжана на пасяджэнні камісіі па тапаніміцы і ўвекавечанні гістарычнай і культурнай спадчыны г. Магілёва (падстава – зварот мясцовага дабрачыннага Фонду памяці Георгія Каніскага).

З 13 верасня 2023 г. да 13 кастрычніка 2023 г. установай «Рэдакцыя газеты «Веснік Магілёва» вывучалася грамадская думка па пытанні перайменавання плошчы Арджанікідзэ ў плошчу імя свяціцеля Георгія Каніскага. Былі прапанаваны наступныя варыянты:

- «Плошча Арджанікідзэ»;
- «Плошча свяціцеля Георгія Каніскага»;
- прапануйце свой варыянт назвы плошчы.

Па выніках вывучэння грамадскай думкі на прыканцы кастрычніка будзе праведзена паўторнае пасяджэнне камісіі па тапаніміцы і ўвекавечанні гістарычнай і культурнай спадчыны г.Магілёва па гэтым пытанні.

Ваша прапанова па перайменаванні плошчы ў «Блізкі Вал» будзе таксама разгледжана на пасяджэнні камісіі па тапаніміцы і ўвекавечанні гістарычнай і культурнай спадчыны г. Магілёва.

У выпадку нязгоды з дадзеным адказам у адпаведнасці з артыкулам 20 Закона Рэспублікі Беларусь ад 18.07.2011 №300-З «Аб зваротах грамадзян і юрыдычных асоб», Вы маеце права абскардзіць яго ў Магілёўскі абласны выканаўчы камітэт (вул.Першамайская, 71).

Намеснік старшыні А.У.Сцельмашок

Рагоўская
Чычоў 42 21 56